УДК 373.31

# РАЗВІЦЦЁ ТВОРЧЫХ ЗДОЛЬНАСЦЯЎ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ У АДУКАЦЫЙНЫМ ПРАЦЭСЕ СРОДКАМІ ФАЛЬКЛОРУ

# DEVELOPMENT OF CREATIVE ABILITIES OF PRIMARY SCHOOL IN THE EDUCATIONAL PROCESS THROUGH FOLKLORE

*Н. У. Мурашка*
*N. V. Murashka*
Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка
Навук. кір. – А. С. Шылава, канд. пед. навук, дацэнт

Праблема развіцця творчых здольнасцяў малодшых школьнікаў выклікае неабходнасць пошуку і ўкаранення новых падыходаў да арганізацыі і правядзення адукацыйнага працэсу, якія спрыяюць эфектыўнаму засваенню ведаў, уменняў, навыкаў і забяспечванню дасягнення загадзя спраектаваных вынікаў на аснове ўзаемадзеяння суб'ектаў дзейнасці.

The problem of developing the creative abilities of primary schoolchildren necessitates the search and implementation of new approaches to organizing and conducting the educational process that contribute to the effective assimilation of knowledge, skills, and ensure the achievement of pre-designed results based on the interaction of stakeholders.

*Ключавыя словы:* творчыя здольнасці; фальклор.
*Key words:* creativity; folklore.

Сучасныя ўмовы грамадскага жыцця патрабуюць ад чалавека самастойнасці, кампетэнтнасці, творчасці, гатоўнасці да генеравання новых ідэй, знаходжанню выхаду з любой праблемнай сітуацыі, прыняцця нестандартных рашэнняў, здольнасці асвойваць вопыт старэйшых пакаленняў.

Паняцце "творчасць" вызначаецца як дзейнасць, якая нараджае "нешта новае, ніколі раней не існуячае". У дзейнасці малодшых школьнікаў навізна прадукту творчасці мае суб'ектыўны характар: новае для дзіцяці – гэта тое што ён упершыню стварыў. Гэта прадукты дзіцячай творчасці ў галіне малявання, лепкі, складання вершаў і песень, драматызацыі. У выніку творчай дзейнасці фарміруюцца і развіваюцца творчыя здольнасці.

Адной з найважнейшых задач, якія стаяць перад пачатковай школай, з'яўляецца стварэнне спрыяльных умоў для развіцця творчых здольнасцяў малодшых школьнікаў у адукацыйным працэсе:

- заахвочванне і стымуляванне імкнення дзяцей да творчасці;
- вера ў сілы і магчымасці кожнага вучня;
- спрыяльны псіхалагічны клімат у вучнёўскім калектыве: стварэнне атмасферы добразычлівасці, клопату пра кожнага, даверу і патрабавальнасці;
- выкарыстанне разнастайных творчых заданняў: па ступені цяжкасці і складанасці, зместу і форме іх прад'яўлення, абапіраючыся на "зону бліжэйшага развіцця кожнага вучня";
- мэтазгоднасць выкарыстання для дзяцей творчых заданняў, якія стымулююць творчую дзейнасць і развіваюць адпаведныя ўменні;
- стварэнне сітуацыі поспеху ў выкананні заданняў творчага характару для кожнага вучня.

Для развіцця творчых здольнасцяў малодшых школьнікаў вялікае значэнне мае выкарыстанне ў адукацыйным працэсе фальклорнага матэрыялу.

Сучасная навука не дае адзінай трактоўкі паняцця "фальклор". У нашым даследаванні мы будзем ужываць яго ў больш шырокім значэнні, не толькі як вусная народная творчасць, але і як культуру народа.

Разглядаючы каштоўнасць фальклору як педагагічнага сродка праз прызму развіцця творчых здольнасцяў трэба адзначыць яго натуральнае ўздзеянне на дзяцей дзякуючы сродкам выразнасці, даступнасць для дзяцей з розным узроўнем развіцця, здольнасць стымуляваць развіццё творчых здольнасцяў асобы. Акрамя таго, у фальклорнай традыцыі няма падзелу на выканаўцаў і гледачоў, усе прысутныя з'яўляюцца яго ўдзельнікамі і стваральнікамі. Гэты працэс з'яўляецца вельмі істотным, паколькі здымаецца механізм ацэньвання, дзіця разнявольваецца, і сам працэс яго ўдзелу ў песні, танцы, гульні надзяляецца сэнсам.

У педагагічным плане фальклорны матэрыял добры тым, што ён заўсёды меў сувязь з жыццём, ён выхоўвае і развівае, даступны і зразумелы для малодшых школьнікаў. Акрамя таго, ён дае нам магчымасць выбару формаў работы: індывідуальныя, групавыя, калектыўныя. Гульнёвая і творчая дзейнасць, якую прадугледжвае фальклорны матэрыял, дапамагае забяспечыць актыўнасць і свядомасць удзелу вучняў у працэсе навучання, што абавязкова вядзе да трываласці вынікаў навучання.

Фальклор прадстаўлены традыцыямі і звычаямі, гульнямі, песнямі, танцамі, вуснай народнай творчасцю. Разгледзім патэнцыяльныя магчымасці фальклору на канкрэтных прыкладах.

Праца настаўніка з творамі вуснай народнай творчасці для развіцця творчых здольнасцяў можа быць разнастайнай: выразнае чытанне, драматызацыя, складанне казак і легенд вучнямі, творчая выяўленчая праца (маляванне, лепка з пластыліну) і г.д.

У галіне развіцця творчых здольнасцяў народная цацка таксама дае нам магчымасці для дзейнасці: гульні, інсцэніроўкі казак, легенд і г.д., тэатралізацыя, з дапамогай батлеечнага тэатра, выяўленчая дзейнасць і інш.

Яшчэ адным кампанентам фальклору з'яўляюцца народныя святы. У іх ёсць прыгажосць і паэзія, адпачынак і весялосць, легенды і паданні, і з кожным з іх звязаны свае абрады, звычаі і традыцыі.

Праца настаўніка з народнымі традыцыямі і абрадамі можа ўяўляць сабой:

1. Разбор і абмеркаванне. Праца з абрадам заўсёды пачынаецца са знаёмства з ім.

2. Драматызацыя. Інсцэніроўка абрадаў або іх фрагментаў дапамагае развіваць творчыя здольнасці дзяцей, развівае ўменне працаваць у групах.

3. Расповяд-паказ: пазакласнае мерапрыемства, дзе дзеці разам з настаўнікам аднаўляюць, распавядаюць і паказваюць які-небудзь абрад.

4. Творчая праца: маляванне, падрыхтоўка праектаў самастойна або з бацькамі. Такая праца развівае творчыя здольнасці вучняў, спрыяе ўзаемадзеянню з дарослымі і з аднагодкамі, аб'ядноўвае.

Для развіцця творчых здольнасцяў малодшых школьнікаў фальклорны матэрыял можна выкарыстоўваць на ўроках беларускай мовы, літаратурнага чытання, працоўнага навучання і выяўленчага мастацтва, а таксама на ўроках фізічнай культуры ў выглядзе гульняў.

У пазавучэбай дзейнасці фальклорны матэрыял мэтазгодна выкарыстоўваць у розных яе відах: гульнёвай, дасугава-забаўляльнай, выяўленча-мастацкай, спартыўна-аздараўленчай. Вельмі важна, каб кожная з іх была накіравана на выхаванне ў дзяцей малодшага школьнага ўзросту праблемна-каштоўнасных адносін.

Намі была распрацавана сістэма вывучэння фальклорнага матэрыялу ў пазавучэбнай дзейнасці [1, 2], якая ўключае некалькі этапаў:

Этап знаёмства. Гэта правядзенне тэматычных класных гадзін у 2 класе, дзе адбываецца знаёмства вучняў з асаблівасцямі правядзення святаў, на якім настаўнік сумесна з часткай вучняў знаёміць клас з якой-небудзь традыцыяй.

Этап распаведу. Гэта правядзенне паказаў вучнямі 3 класа. Паказ – гэта арганізаванае пазакласнае мерапрыемства для бацькоў, дзе вучні распавядаюць аб традыцыі правядзення якога-небудзь свята і паказваюць яго фрагмент. На гэтым этапе вучні выступаюць у ролі выканаўцаў і праяўляюць свае творчыя здольнасці, прычым кожнаму вучню класа знаходзіцца заданне па яго сілах і здольнасцях.

Этап драматызацыі. Гэта этап рэканструкцыі якога-небудзь свята ці абраду (напрыклад, абрад калядавання [1], традыцыйнаыя святы: масленіца, вялікдзень [2] і г.д.) для вучняў сваёй школы. Гэты этап найлепш падыходзіць для вучняў 4 класа, таму што дзеці ўжо добра знаёмы з традыцыямі, якія апрабаваны на самых удзячных глядачах – бацьках.

Як паказаў вопыт правядзення такіх мерапрыемстваў, амаль усе вучні жадаюць удзельнічаць у іх. Для гэтага настаўніку, ведаючы асаблівасці сваіх дзяцей, вельмі важна размеркаваць ролі такім чынам, каб кожны з іх выступіў паспяхова. Можна падрыхтаваць некалькі саставаў выступаючых, каб усе дзеці маглі праявіць сябе. Акрамя таго, некалькі саставаў неабходны яшчэ і для таго, каб дзеці вучыліся назіраць адзін за адным падчас выступлення і ўмелі падстрахаваць сваіх сяброў.

Такім чынам, фальклор нясе ў сабе патэнцыяльныя магчымасці для развіцця творчых здольнасцяў малодшых школьнікаў. Прастата, лаканічнасць, эмацыйнасць, насычанасць, выразнасць фальклорнага матэрыялу зразумелая для малодшых школьнікаў, ён адказвае сучасным прынцыпам навучання, што абавязкова вядзе да эфектыўнасці арганізацыі і правядзення адукацыйнага працэсу; прадастаўляе шырокія магчымасці выкарыстання фальклору ў вучэбнай і пазавучэбнай дзейнасці. Акрамя таго, сучасныя дзеці праяўляюць цікавасць да фальклорнага матэрыялу, што можа стаць асновай для рашэння праблемы развіцця творчых здольнасцяў у дзяцей малодшага школьнага ўзросту.

## 🕮 *Літаратура*


1. Мурашка, Н. У. Фальклор як сродак фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі малодшых школьнікаў у пазакласнай дзейнасці / Н. У. Мурашка, А. С. Шылава // Пачатковае навучанне: сям'я, дзіцячы сад, школа. – 2019. – № 11. – С. 59–65.
2. Мурашка, Н. У. Народныя традыцыі як сродак фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі малодшых школьнікаў у пазакласнай дзейнасці / Н. У. Мурашка, А. С. Шылава // Пачатковае навучанне: сям'я, дзіцячы сад, школа. – 2020. – № 3. – С. 54–61.